УДК 930 : 39 (476)

**А. У. Літвінскі**
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вул. Войкава, 21, 225404 Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, +375 (163) 50 91 01, litvinski@inbox.ru

# СЛАВЯНСКІ ЭТНАГЕНЕЗ У НАВУКОВЫХ ТВОРАХ БЕЛАРУСКІХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX — ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

В представленной статье рассматривается вклад белорусских учёных второй половины XIX — начала XX века в исследование проблемы происхождения славян. Проводится краткий обзор историографии по теме статьи; определяется база и информационный потенциал источников, на основании которых подготовлена данная работа; лаконично характеризуются методологические принципы и методы исследования.

В статье показана определённая зависимость выводов белорусских исследователей по вопросам славянского этногенеза от существовавшей в рассматриваемый период европейской и российской славистической традиции. Проанализированы позиции белорусских учёных данного периода по следующим вопросам: место славян среди народов индоевропейской языковой семьи; соотношение славян и балтов в составе данной семьи; возможности использования лингвистических источников в ходе определения территории славянской прародины; локализация данной прародины.

**Ключевые слова:** этногенез; славяне; славистика; белорусские слависты; «балто-славянская проблема»; протокультура; прародина; белорусы.

Библиогр.: 31 назв.

**A. B. Litvinski**
Baranovichi State University, Ministry of Education of the Republic of Belarus, 21, Voykova str., 225404 Baranovichi, the Republic of Belarus, +375 (163) 50 91 01, litvinski@inbox.ru

# SLAVIC ETHNOGENESIS IN THE SCIENTIFIC WORKS OF BELARUSIAN RESEARCHERS (SECOND HALF OF XIX — EARLY XX CENTURY)

The article discusses the contribution of Belarusian scientists of the second half of XIX — early XX century into the study of the Slavs origin problem. An overview of the historiography on the subject of the article is conducted; the information potential of the used sources on the basis of which the present work is written is identified; the methodological principles and research methods are described.

The article illustrates dependence of the findings of Belarusian researchers of Slavic ethnogenesis from existing at a certain period European and Russian Slavic Studies traditions. The point of view of Belarusian scientists of that period is analyzed on the following issues: the place of the Slavs among the peoples of the Indo-European language family; the ratio of the Slavs and Balts in the composition of this family; the possibility to use linguistic sources when identifying the territory of the Slavic ancestral homeland; localization of the ancestral home.

**Key words:** ethnogenesis; the Slavs; the Slavic Studies; Belarusian Slavic Studies scientists; “Balto-Slavic problem”; proto-culture; the ancestral homeland; Belarusians.

Ref.: 31 titles.

**Уводзіны.** Паходжанне славян як навуковая праблема прыцягвала ўвагу шматлікіх айчынных і замежных даследчыкаў. Безумоўна, яна мае грамадскую і навуковую актуальнасць і ў наш час. Грамадскую — таму што размова ідзе пра паходжанне продкаў сучасных народаў славянскай моўнай групы; навуковую — таму што дадзеная праблема дагэтуль вельмі далёкая ад вырашэння, якое задаволіла б пераважную большасць гісторыкаў і археолагаў, лінгвістаў і этнографаў, генетыкаў і антраполагаў.

Пры гэтым трэба зазначыць, што сама логіка навуковай дзейнасці вымагае перыядычнага звароту да напрацовак прадстаўнікоў ранейшых пакаленняў. Нездарма ж любая сур’ёзная праца па славяназнаўстве насычана спасылкамі на работы папярэднікаў, як правіла, найбольш аўтарытэтных. Адпаведным чынам, узнікае неабходнасць у правядзенні даследаванняў гістарыяграфічнага характару

© Літвінскі А. У., 2016

і публікацыі іх вынікаў. У дадзеным артыкуле разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі вывучэння праблемы паходжання славян айчыннымі спецыялістамі (гісторыкамі, мовазнаўцамі, этнографамі, фалькларыстамі, краязнаўцамі), чыя навуковая дзейнасць разгарнулася ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя. Высвятленне гэтых тэндэнцый, іх лаканічная характарыстыка і складае мэту артыкула.

У выдадзеных раней працах, дзе знайшоў адлюстраванне працэс развіцця беларускай славістыкі, пытанні даследавання айчыннымі навукоўцамі этнагенезу славян фактычна не вылучаліся ў асобны сюжэт і разглядаліся ўскосна, перш за ўсё, у агульным рэчышчы станаўлення і развіцця беларусазнаўства. Да такіх прац найбольшай значнасці належаць работы А. М. Пыпіна [1, с. 125—173], Я. Ф. Карскага [2, с. 199—429], М. В. Доўнар-Запольскага [3, с. 392—402], В. К. Бандарчыка [4—7], Д. У. Карава [8], І. А. Марзалюка [9], а таксама дзве калектыўныя працы савецкіх славістаў [10—11]. Пэўны ўклад у даследаванне праблемы ўнёс і аўтар гэтых радкоў, у работах якога адлюстраваны яе некаторыя аспекты [12—14]. Аднак выкладанне ў сістэматызаваным выглядзе матэрыялу па тэме робіцца аўтарам менавіта ў дадзеным артыкуле. Пры гэтым пэўныя пазіцыі ўдакладняюцца і канкрэтызуюцца ў параўнанні са зместам нашых ранейшых прац, у тым ліку, і ў параўнанні з манаграфіяй.

**Матэрыял і метады даследавання.** Фонд крыніц па тэме складаецца з прац беларускіх славістаў азначанага перыяду. Асаблівую цікавасць для даследчыкаў маюць навуковыя творы А. С. Будзіловіча [15—18] і Я. Ф. Карскага [2; 19; 20], у якіх даволі выразна выкладзены канцэптуальныя пазіцыі аўтараў па праблеме паходжання славян. Некаторыя аспекты тэмы высвятляюцца ў працэсе аналізу работ М. В. Каяловіча [21; 22], А. П. Сапунова [23], М. В. Доўнар-Запольскага [24; 25], Е. Р. Раманава [26; 27], А. Я. Багдановіча [28]. Існуючая база крыніц стварае перадумовы плённага даследавання, у выніку якога можна сфармуляваць высновы з дастаткова высокім узроўнем верыфікаванасці.

У працэсе навукова-гістарычнага аналізу гэтага комплексу крыніц можна высветліць ступень зацікаўленасці даследчыкаў славяназнаўчай праблематыкай, ацаніць узровень іх навуковай падрыхтоўкі, іх метадалагічныя пазіцыі (у пэўных выпадках), прыхільнасць тагачасных айчынных рупліўцаў навукі да таго або іншага варыянту славістычнай традыцыі, якая намаганнямі еўрапейскіх і расійскіх даследчыкаў ужо склалася да сярэдзіны XIX стагоддзя. А самае галоўнае — крытычны аналіз прац пералічаных вышэй аўтараў дазволіць ахарактарызаваць іх пазіцыі па шэрагу актуальных і тады, і цяпер пытаннях славянскага этнагенезу.

У ходзе даследавання аўтар артыкула прытрымліваўся метадалагічных прынцыпаў аб'ектыўнасці і гістарызму. Прымяняліся наступныя метады навукова-гістарычнага даследавання: гісторыка-генетычны, параўнальна-гістарычны, структурна-функцыянальны, а таксама комплексны міждысцыплінарны падыход, які прадугледжвае крытычны аналіз гістарычнай, гістарыяграфічнай, крыніцазнаўчай, археалагічнай, этналагічнай, этнаграфічнай, лінгвістычнай інфармацыі.

Мы разумеем, што ўключэнне ў склад беларускіх даследчыкаў М. В. Каяловіча, А. С. Будзіловіча, Я. Ф. Карскага, А. П. Сапунова, Е. Р. Раманава, А. Я. Багдановіча і нават М. В. Доўнар-Запольскага можа выклікаць пярэчанні сярод апанентаў, паколькі фактычна ўсе названыя не лічылі сябе беларусамі ў тым сэнсе, у якім успрымаюць і разумеюць беларускую ідэнтычнасць нашы сучаснікі. Аднак, у адпаведнасці з прынцыпам гістарызму, нельга было б ад іх чакаць праяў стоадсоткавай беларускасці ва ўмовах, калі беларуская нацыянальная ідэя і тая ж беларуская ідэнтычнасць толькі фарміраваліся. Таму мы палічылі мэтазгодным у дадзенай сітуацыі кіравацца фактарамі «зямлі і крыві» і аднесці іх да беларускіх навукоўцаў. Больш падрабязная аргументацыя па гэтым дыскусійным пытанні выкладзена ў прадмове да манаграфіі аўтара дадзенага артыкула [14, с. 8, 9]. Таксама там абгрунтаваны наш падыход да забеспячэння карэктнасці перакладу з рускай мовы на беларускую пры цытаванні крыніц [14, с. 11, 12].

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Цікавасць да праблемы паходжання славян на працягу XIX стагоддзя займела некалькі аспектаў. З аднаго боку, яна сталася праяваю агульнага патрыятычнага ўздыму славянскіх народаў. Пошук сваіх каранёў у такіх умовах выглядаў цалкам натуральна. З другога боку, даследаванні этнагенетычнага характару, з пэўным адценнем рамантызму, часам наіўнага, былі ўласцівыя еўрапейскай навуцы дадзенага перыяду і знаходзіліся ў рэчышчы развіцця

гуманітарыстыкі таго часу. Іншымі словамі, да 1860-х — 1870-х гадоў быў закладзены даволі трывалы падмурак славістыкі. На гэтай базе разгортваліся далейшыя даследаванні, у тым ліку і па праблеме паходжання славян. Беларускія навукоўцы пры гэтым арыентаваліся на ўжо існаваўшую ў той час еўрапейскую і расійскую славістычную традыцыю, пра што сведчаць шматлікія па-рознаму аформленыя спасылкі на творы тагачасных навуковых аўтарытэтаў (і тэкставыя, і пазатэкставыя).

У працэсе вырашэння гэтай праблемы навукоўцы зыходзілі з факту прыналежнасці славянскіх моў да індаеўрапейскай сям'і. Адпаведным чынам, у пэўных работах айчынных даследчыкаў рабіліся спробы неяк інтэрпрэтаваць дадзены факт. Праўда, гэтыя інтэрпрэтацыі часам неслі на сабе відавочны адбітак тэрміналагічнай блытаніны. А. П. Сапуноў, напрыклад, адзначаў: «Верагодней за ўсё, скіфы не складалі адной народнасці; але ў Скіфіі, па сваёй колькасці і значэнні, пераважалі арыйцы, менавіта славяне; асабліва гэта трэба сказаць пра скіфаў-аратых, што жылі па Дняпры» [23, с. 4]. З кантэксту фразы вынікае, што «арыйцамі» А. П. Сапуноў называў усе народы, індаеўрапейскія па мове. Тэрмін «скіфы» ён ужываў для вызначэння не столькі этнамоўнай, колькі тэрытарыяльнай супольнасці.

Такое размеркаванне тэрмінаў шмат у чым тлумачылася тагачаснай навуковай традыцыяй, паводле якой доўгі час індаеўрапейскія народы сапраўды называліся арыйскімі (не будзем забывацца на тое, што станаўленне індаеўрапеістыкі як самастойнай навуковай дысцыпліны адбывалася на грунце зацікаўленасці індыйскаю культураю і, у прыватнасці, санскрытам). Аднак у часы, калі разгарнулася навуковая творчасць А. П. Сапунова, уяўленне пра непасрэднае паходжанне славян ад арыяў ужо не карысталася прызнаннем у сур'ёзных навукоўцаў.

Своеасаблівую даніну састарэлай да яго часу навуковай традыцыі таксама аддаў і А. Я. Багдановіч. «Няма сумнення, што і славянскія народы ў тыя аддаленыя часы, калі яны жылі на сваёй прарадзіме, дзесьці каля горнага хрыбта Гіндукуш, адносна гор падзялялі першабытныя погляды роднасных плямён», — упэўнена (і памылкова) сцвярджаў у сваім этнаграфічным нарысе бацька выдатнага беларускага паэта, калі высвятляў вытокі архаічных вераванняў беларусаў [28, с. 26].

Ні А. П. Сапуноў, ні А. Я. Багдановіч не былі прафесійнымі мовазнаўцамі, і брак ведаў часам быў прычынай не вельмі абгрунтаваных высноў, якія рабілі гэтыя даследчыкі. У сваю чаргу, А. С. Будзіловіч і Я. Ф. Карскі, якія мелі акадэмічную мовазнаўчую падрыхтоўку, зразумела, больш сур'ёзна ставіліся да вырашэння пытання аб месцы славянскіх моў у індаеўрапейскай сям'і і таму ўстрымліваліся ад катэгарычных сцвярджэнняў аб непасрэдным паходжанні славян ад арыяў. А. С. Будзіловіч добра ўсведамляў тое, што славянская мова ў сваім развіцці зазнала пэўную эвалюцыю. Ён вылучаў некалькі лексічных пластоў у славянскай мове і далёка не ўсе словы адносіў да непасрэднай спадчыны гіпатэтычнай індаеўрапейскай мовы, адносячы значную частку іх да пазнейшых часоў [17, с. VII—IX, XVI, 48—51].

Даследчык Я. Ф. Карскі палічыў неабходным адзначыць факт існавання адносна адзінага індаеўрапейскага народа «ў часы дагістарычныя», мяркуючы, што тады гэты народ «не падзяляўся яшчэ прыкметна на плямёны, размаўляў адной моваю, адрозніваўся падабенствам нораваў і звычаяў, меў аднолькавыя рэлігійныя вераванні» [20, с. 1]. З гэтай нагоды варта адзначыць, што мовазнаўца тут выявіў сябе прыхільнікам тэорыі «генеалагічнага дрэва», паводле якой мовы нібыта адгаліноўваюцца ад агульнага ствала, паступова разыходзячыся ў часе і прасторы. І сапраўды, ён у іншай працы звярнуў увагу свайго чытача на тое, што ў старажытнасці існавала «адно непадзельнае індаеўрапейскае племя» [19, с. 5]. Прычыну распаду гэтага «племені» Я. Ф. Карскі тлумачыў такім чынам: «Але па меры росту гэтага народу ад яго пачалі аддзяляцца новыя галіны, што пайшлі ў іншыя краіны, якія адрозніваліся сваімі асаблівасцямі; тут часта даводзілася ім таксама сустракацца з народамі іншых плямёнаў, якія размаўлялі на чужой для іх мове. Усё гэта ўплывала на мову народных мас, што сюды выселіліся. Зрабіўшыся асобнымі, самастойнымі народнасцямі, гэтыя плямёны ў большай або меншай ступені змянілі і сваю агульную дзедаўскую мову» [20, с. 1].

Як вынікае з гэтых слоў, Я. Ф. Карскі прызнаваў, што міжмоўныя кантакты маглі істотна паўплываць на працэс фарміравання новай мовы, аднак вырашальным фактарам глотагенезу ён, на наш погляд, усё ж такі лічыў фактар унутраных моўных інавацый, для якіх знешняе ўздзеянне магло служыць каталізатарам, але не больш за тое. Дарэчы, так або прыкладна так і сам Я. Ф. Карскі, і іншыя айчынныя даследчыкі тлумачылі факт распаду славянскай супольнасці на асобныя падгрупы і народы па аналогіі з індаеўрапейскай супольнасцю.

Яшчэ адным аспектам вывучэння славянскага этнагенезу была (як і цяпер ёсць) так званая балта-славянская праблема. Як вядома кожнаму, хто на даволі высокім навуковым узроўні даследуе паходжанне славян, дадзеная праблема зводзіцца да пошуку адказу на пытанне: ці прызнаваць існаванне ў часе і прасторы пэўнай стадыі балта-славянскага адзінства, як прамежкавай на шляху фарміравання асобнай славянскай мовы, ці тлумачыць гэтую з’яву з пункту гледжання міждыялектных кантактаў, сцвярджаючы пры гэтым, што балцкая і славянская мовы паасобку вылучыліся з індаеўрапейскай сям’і? Гэтай праблеме беларускія славісты ўдзялялі, аднак, мала ўвагі. Характарызуючы этнічную гісторыю Беларусі, Я. Ф. Карскі абмежаваўся, напрыклад, вельмі лаканічнай заўвагай. «Тут жыло тое племя, якое паслужыла прататыпам славянам і літоўцам», — зазначаў аўтар фундаментальнага твора «Белорусы» [2, с. 33]. Аднак далей на старонках гэтага твора ён не апелюе да гэтай праблемы, ведучы размову ў дадзеным кантэксце толькі пра славян і славянскія народы. Прыведзеная вышэй цытата нясе ў сабе зусім мала інфармацыі, і таму нельга ўпэўнена ахарактарызаваць пазіцыю навукоўца па «балта-славянскай» праблеме.

Даследчык А. П. Сапуноў таксама выказаўся па гэтай праблеме вельмі сцісла, мімаходзь. «Народы племені літоўскага, што жылі тут таксама, разам з братамі сваімі славянамі, старабыльцы на сваёй зямлі», — вось такая нешматслоўная сентэнцыя віцебскага гісторыка з гэтай нагоды [23, с. 8]. Наўрад ці тут варта бачыць прызнанне нейкага асаблівага балта-славянскага адзінства, тым больш, што А. П. Сапуноў быў схільны лічыць славян аўтахтонамі Усходняй Еўропы і бачыў іх нават там, дзе іх адмаўляліся бачыць сур’ёзныя навуковыя аўтарытэты — яго сучаснікі. Аб гэтым сведчыць вось такая фраза: «Славяне са старажытнейшых ужо часоў жывуць на сваіх карэнных месцах, і Усходняя Еўропа, ад берагоў Чорнага мора да берагоў Балтыйскага, была заселена толькі славянамі, менавіта рускімі» [23, с. 9].

Значна больш увагі тагачасныя беларускія славісты ўдзялялі праблеме вызначэння славянскай прарадзімы. Акрамя зразумелай навуковай зацікаўленасці, так бы мовіць, «агульнаславістычнага» характару, яны ў гэтым пытанні кіраваліся неабходнасцю вызначыць месца беларусаў сярод іншых славянскіх этнічных супольнасцей. І дадзены матыў быў для іх, бадай што, больш важным у параўнанні з імкненнем даследаваць працэс паходжання славян. З пералічаных вышэй імёнаў выключэннем з дадзенага правіла быў толькі А. С. Будзіловіч, якога нельга назваць беларусазнаўцам, аднак якраз ён і ўнёс найбольшы ўклад у даследаванне праблемы вызначэння прарадзімы нашых продкаў у параўнанні з іншымі айчыннымі навукоўцамі. Гэтаму, як і іншым аспектам славянскага этнагенезу, прысвечана яго праца «Первобытные славяне в их языке, быте и понятиях по данным лексикальным: исследования в области лингвистической палеонтологии славян» [17; 18], якую можна было б назваць фундаментальнай для таго часу, калі б не той факт, што яна не была скончана аўтарам.

Паколькі А. С. Будзіловіч быў лінгвістам, то і зразумела, што менавіта інфармацыю лінгвістычных крыніц ён паклаў у аснову сваёй навуковай рэканструкцыі. Шлях, які абраў навуковец, дазволіў яму з дастатковай ступенню верыфікаванасці своеасаблівам чынам «аднавіць» протакультуру першых, яшчэ адносна непадзеленых славян (зразумела, з той агаворкаю, што даследаванне ўсё ж такі не было даведзена да канца). Такі шлях стаўся плённым і для наступных пакаленняў даследчыкаў, перш за ўсё, індаеўрапеістаў і славістаў — дастаткова ў якасці добра вядомых зацікаўленаму чытачу прыкладаў узгадаць працу Т. В. Гамкрэлідзэ і В. У. Іванава [29], а таксама працу А. М. Трубачова [30].

Высновы, да якіх прыйшоў А. С. Будзіловіч, наступныя: 1) рэгіён першапачатковага жыхарства славян (ці іх непасрэдных продкаў) быў багаты на лясы і балоты, але далёкі ад мора [17, с. 289]; 2) «неабходна меркаваць, што праславяне жылі ва ўмераным поясе Старога Свету і прытым у еўрапейскай яго частцы» [17, с. 370]; 3) прарадзіма славян знаходзілася паміж Падняпроўем, уключаючы яго тэрыторыю, і Карпатамі [17, с. 390—392].

Такім чынам, аўтар схіляўся да адносна ўсходняга варыянту лакалізацыі прарадзімы славян у параўнанні, да прыкладу, з Вісла-Одэрскай гіпотэзай.

Зазнала пэўную, хаця і не вельмі значную эвалюцыю, пазіцыя Я. Ф. Карскага па гэтым пытанні. Калі ў 1903 годзе славуты беларусазнаўца ўзгадваў «Прыкарпацка-Прыпяцкую тэорыю прарадзімы славян» [2, с. 70], то ў 1916 годзе ён бачыў першапачатковую тэрыторыю рассялення гіпатэтычнага

праславянскага этнасу ў водазборы «Прыпяці, верхняга Нёмана і ніжняй Беразіны» [19, с. 11]. Магчыма, гэтая эвалюцыя тлумачылася распаўсюджаннем папулярнага сярод беларусазнаўцаў пераканання, што беларусы якраз і складаюць першапачатковы, чысты, у пэўным сэнсе гэтага слова, тып славянства. Са спасылкай на выдатнага чэшскага славіста Л. Нідэрле, які ўжо на мяжы XX—XXI стагоддзяў займеў вядомасць у якасці класіка славяназнаўства, Я. Ф. Карскі сцвярджаў, што беларусы з'яўляюцца «больш чыстымі прадстаўнікамі» славян «у адносінах антрапалагічных» [2, с. 34]. Адсюль па-свойму лагічна вынікаў тэзіс, паводле якога прарадзіму славян трэба шукаць на тэрыторыі Беларусі.

З некалькі іншых пазіцый фактычна падтрымаў сцвярджэнне Я. Ф. Карскага аб антрапалагічнай чысціні славянскага тыпу ў беларусаў М. В. Доўнар-Запольскі. Паводле яго тлумачэння, «беларускае племя ў сваім гістарычным мінулым не злівалася з іншымі народамі, у той час як вялікаросы, займаючы землі фінскіх плямёнаў, змешваліся з імі», а ўкраінцы змешваліся з цюркамі [31, с. 259].

Айчынныя даследчыкі, нягледзячы на прыкметную тэндэнцыю паглыбляць карані славянства, а можа, і ў рэчышчы гэтай тэндэнцыі, у прынцыпе разумелі, што продкаў славян неабходна шукаць сярод супольнасцей, з большай або меншай паўнатою апісаных антычнымі аўтарамі яшчэ да таго, як этнонім «славяне» (у розных варыянтах яго перадачы на літаратурных мовах позняй антычнасці і ранняга Сярэднявечча) трапіў на старонкі гістарычных крыніц.

Радыкальны пункт гледжання ў дадзеным кантэксце быў выказаны А. П. Сапуновым, які даволі неразборліва залічваў да славян і значную частку скіфаў, і сарматаў, і неўраў, і венедаў/венетаў (вінідаў, па яго тэрміналогіі) [23, с. 3—9]. Напэўна, тут мы маем справу са спрошчаным поглядам даследчыка на этнагенез, паводле якога пад улік бярэцца, перш за ўсё, непарыўная пераемнасць пакаленняў, якая нібыта забяспечвае этнічную пераемнасць. Аднак этнагенез — працэс значна больш складаны, і таму нельга некрытычна залічваць да славян прадстаўнікоў тых супольнасцей, адносна якіх у нас няма дакладнай інфармацыі пра іх мову і этнічную самасвядомасць.

Як гісторык , Я. Ф. Карскі па гэтым пытанні выказваўся не так радыкальна, як А. П. Сапуноў, але і ён лічыў продкамі славян неўраў, будзінаў і венедаў [2, с. 37—39]. Пры гэтым класіка беларусазнаўства наўрад ці бянтэжыла немагчымасць правесці непарыўную лінію ад гэтых старажытных супольнасцей да гістарычных славян. Аднак, з іншага боку, трэба ўлічыць, што такія погляды тады былі даволі папулярнымі ў еўрапейскай і расійскай славістыцы.

**Заключэнне.** Беларускія славяназнаўцы, чыя навукова-творчая дзейнасць прыпала на другую палову XIX — пачатак XX стагоддзя, унеслі пэўны ўклад у вырашэнне міждысцыплінарнай навуковай праблемы паходжання славян. У той або іншай ступені яны выкарыстоўвалі напрацоўкі сваіх папярэднікаў і сучаснікаў — еўрапейскіх і расійскіх славістаў. Адсюль вынікала ў некаторых выпадках пэўная другаснасць, несамастойнасць пазіцый па дадзенай праблеме такіх навукоўцаў, як А. П. Сапуноў і А. Я. Багдановіч. Абодва яны значна больш упэўнена адчувалі сябе як беларусазнаўцы, а вось у асвятленні пытанняў славістыкі мусілі апеляваць да навуковых аўтарытэтаў і часам рабілі гэта без належнай ступені крытычнасці.

Больш грунтоўнымі былі навуковыя пазіцыі А. С. Будзіловіча і Я. Ф. Карскага, якія, таксама арыентуючыся на існуючую славістычную традыцыю, выказвалі свае дастаткова аргументаваныя погляды па пытаннях паходжання славян. Можна сцвярджаць, што якраз лінгвістычная па сваім характары аргументацыя пэўных поглядаў па пытаннях славянскага этнагенезу была найбольш пераканаўчай у навуковых творах айчынных славяназнаўцаў.

Даследчык А. С. Будзіловіч нават зрабіў у цэлым удалую для свайго часу спробу рэканструкцыі протакультуры самых першых славян і адказаў на пытанне аб іх прарадзіме. Неаднойчы асвятляў дадзенае пытанне і Я. Ф. Карскі, пазіцыя якога зазнала пэўную эвалюцыю. Наогул, амаль усе беларускія даследчыкі азначанага перыяду, з большай або меншай ступенню аргументацыі, схіляліся да думкі пра аўтахтоннасць славян на тэрыторыі Усходнееўрапейскай раўніны і пра беларусаў як прадстаўнікоў найменш зменена тыпу славян.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Пыпин, А. Н. История русской этнографии : в ? т. / А. Н. Пыпин. — СПб. : [б. и.], 1892. — Т. 4. Белоруссия и Сибирь. — 488 с.

2. Карский, Е. Ф. Белорусы / Е. Ф. Карский. — Варшава : Тип. Варшав. учеб. округа, 1903. — Т. 1. Введение в изучение языка и народной словесности. С приложением двух карт. — 10, 467 с.

3. Доўнар-Запольскі, М. В. Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. — Мінск : БелЭн, 1994. — 510 с.

4. Бандарчык, В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі. Пачатак XX ст. / В. К. Бандарчык. — Мінск : Навука і тэхніка, 1970. — 123 с.

5. Бандарчык, В. К. Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі / В. К. Бандарчык. — Мінск : Навука і тэхніка, 1972. — 168 с.

6. Бандарчык, В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. / В. К. Бандарчык. — Мінск : Навука і тэхніка, 1964. — 232 с.

7. Бандарчык, В. К. Еўдакім Раманавіч Раманаў : Жыццё і навуковая дзейнасць / В. К. Бандарчык. — Мінск : Выд-ва Акадэміі навук БССР, 1961. — 305 с.

8. Карев, Д. В. Белорусская и украинская историография конца XVIII — начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев / Д. В. Карев. — Вильнюс : ЕГУ, 2007. — 312 с.

9. Марзалюк, І. А. Міфы «адраджэнскай» гістарыяграфіі Беларусі : манаграфія / І. А. Марзалюк. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. — 148 с.

10. Славяноведение в дореволюционной России : библиогр. слов. — М. : Наука, 1979. — 426 с.

11. Славяноведение в дореволюционной России: изучение южных и западных славян. — М. : Наука, 1988. — 682 с.

12. Літвінскі, А. У. Паходжанне славян у навуковай інтэрпрэтацыі Я. Ф. Карскага / А. У. Літвінскі // Историко-философские и социально-политические аспекты сохранения национальной идентичности белорусского общества : Дню Победы советского народа в Великой Отечественной войне посвящается : материалы Респ. науч.-практ. конф., 17 апр. 2015 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол. : А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Демидович (отв. ред.) [и др.]. — Барановичи : БарГУ, 2015. — С. 41—44.

13. Літвінскі, А. У. Уклад А. С. Будзіловіча ў развіццё славістыкі / А. У. Літвінскі // Специалист XXI века: психолого-педагогическая культура и профессиональная компетентность : материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., 22 окт. 2015 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, А. А. Селезнёв (отв. ред.) [и др]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2015. — С. 180—183.

14. Літвінскі, А. У. Развіццё беларускай славістыкі ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя : манаграфія / А. У. Літвінскі. — Баранавічы : РВА БарДУ, 2015. — 167 с.

15. Будилович, А. С. Общеславянский язык в ряду других общих языков древней и новой Европы : в 2 т. / А. С. Будилович. — Варшава : [б. и.], 1892. — Т. 1. — 8, 463 с.

16. Будилович, А. С. Общеславянский язык в ряду других общих языков древней и новой Европы : в 2 т. / А. С. Будилович. — Варшава : [б. и.], 1892. — Т. 2. — 400 с.

17. Будилович, А. С. Первобытные славяне в их языке, быте и понятиях по данным лексикальным: исследования в области лингвистической палеонтологии славян / А. С. Будилович. — Киев : Тип. М. П. Фрица, 1878—1879. — Ч. 1. Вып. 1—2. — 22, 392, 15 с.

18. Будилович, А. С. Первобытные славяне в их языке, быте и понятиях по данным лексикальным: исследования в области лингвистической палеонтологии славян / А. С. Будилович. — Киев : Тип. К. Н. Милевского, 1882. — Ч. 2. Вып. 1. — 153 с.

19. Карский, Е. Ф. Белорусы / Е. Ф. Карский. — М. : Типо-литография Т-ва И. Н. Кушнерев и Ко, 1916. — Т. 3. Очерки словесности белорусского племени. — Вып. 1. Народная поэзия. — 14, 557 с.

20. Карский, Е. Ф. Грамматика древнего церковнославянского языка сравнительно с русским / Е. Ф. Карский. — 13-е изд. — Варшава : Тип. Варшав. учеб. округа, 1908. — 4, 104 с.

21. Коялович, М. О. Лекции по истории Западной России / М. О. Коялович. — М. : [б. и.], 1864. — 348 с.

22. Коялович, М. О. Чтения по истории Западной России профессора М. Кояловича / М. О. Коялович. — Новое изд., перераб. и доп. с 1-го изд. 1864 г. — СПб. : [б. и.], 1884. — 349 с.

23. Сапунов, А. П. Река Западная Двина / А. П. Сапунов. — Витебск : Типо-литография Г. А. Малкина, 1893. — 4, 512, 71 с.

24. Довнар-Запольский, М. В. Исследования и статьи / М. В. Довнар-Запольский. — Киев : [б. и.], 1909. — Т. 1. Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность. — 487 с.

25. Довнар-Запольский, М. В. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия / М. В. Довнар-Запольский. — Киев : [б. и.], 1891. — 7, 170 с.

26. Романов, Е. Р. Белорусский сборник / Е. Р. Романов. — Витебск : Типо-литография Г. А. Малкина, 1887. — Вып. 3 : Сказки. — 444 с.

27. Романов, Е. Р. Белорусский сборник / Е. Р. Романов. — Витебск : Типо-литография Г. А. Малкина, 1891. — Вып. 4 : Сказки космогонические и культурные. — 220 с.

28. Богданович, А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов : Этнографический очерк / А. Е. Богданович. — Гродно : Губерн. тип., 1895. — III, 186 с.

29. Гамкрелидзе, Т. В. Индоевропейский язык и индоевропейцы. Реконструкция и историко-типологический анализ праязыка и протокультуры / Т. В. Гамкрелидзе, В. В. Иванов. — Тбилиси : Изд-во Тбилис. ун-та, 1984. — 1330 с.

30. Трубачёв, О. Н. Этногенез и культура древнейших славян : Лингвистические исследования / О. Н. Трубачёв. — М. : Наука, 2003. — 489 с.

31. Русская история в очерках и статьях / под ред. М. В. Довнар-Запольского. — М. : [б. и.], 1904. — Т. 1. — 607, 2, 8 с.

Поступила в редакцию 16.09.2016.